2. *Котляров, И. В.* Зачем ломать цивилизационный код белорусского общества (социологическое измерение) / И. В. Котляров // Иппокрена. – 2017. – № 1. – С. 126–139.

3. Торжественное собрание по случаю Дня Независимости Беларуси [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/torzhestvennoe-sobranie-po-sluchaju-dnja-nezavisimosti-belarusi-19040. – Дата доступа: 01.01.2019.

# ПЕРШЫЯ ВЫПУСКНІКІ – ВЫКЛАДЧЫКІ КУРСА «ИСТОРИЯ КНИГИ» НА БІБЛІЯТЭЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

***Л. І. Доўнар,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Станаўленне вышэйшай школы па падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў у Беларусі было цесна звязана не толькі з патрэбамі практычнай дзейнасці, але і з вострай неабходнасцю сваіх ўласных выкладчыцкіх і навуковых кадраў. Зрухі ў вырашэнні праблемы можна назіраць ужо ў сярэдзіне 1950-х гг. і ў галіне выкладання «Истории книги» на бібліятэчным факультэце Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (МДПІ), дзе дзякуючы першым выкладчыкам вучэбнага курса гэты прадмет атрымаў далейшае развіццё [3, с. 54], а пазней (1960–1970) пачаў дапаўняцца беларускай тэматыкай. На аснове архіўных матэрыялаў мы працягваем прэзентацыю дзейнасці выкладчыкаў бібліятэчнага факультэта, а менавіта выкладчыкаў з ліку выпускнікоў МДПІ, якія далучыліся да распрацоўкі гісторыка-кнігазнаўчай праблематыкі і спрыялі станаўленню вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў нашай краіне.

Першым выкладчыкам па гісторыі кнігі стаў *Міхаіл Міхайлавіч Колас* (Михаил Михайлович Колос), які скончыў бібліятэчны факультэт экстэрнам у 1953 г. [8, арк. 215] і ўжо ў 1953/1954 навучальным годзе быў залічаны на ½ стаўкі сумяшчальнікам кафедры бібліятэказнаўства. Неўзабаве яму было даручана распрацаваць і выкладаць курс «История книги» [4, арк. 189]. Былі надзеі на М. М. Коласа наконт яго наву-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ковай працы [4, арк. 190], якія, на жаль, не спраўдзіліся. Курс «История книги» ў 1955/1956 навучальным годзе, як пісаў загадчык кафедры М. Ц. Талкачоў, быў «им [М. М. Коласам] освоен по опубликованным материалам», наперадзе чакала «значительная разработка вопроса о типологии произведений печати с учетом интересов комплектования и организации библиотечных фондов. Он же читает уже несколько лет курс “Описание произведений печати и составление алфавитного каталога” (часть 2 курса “Библиотековедение”) и ведет его на должном теоретическом и методическом уровне как в лекционной, так и в практической части» [5, арк. 195]. Праз год за распрацаваны курс «История книги», за педагагічнае майстэрства старшы выкладчык М. М. Колас атрымаў адзнаку «вполне удовлетворительно» [6, арк. 193]. У 1959/1960 навучальным годзе «История книги» для студэнтаў першага курса складала на стацыянары 42 лекцыйныя і 24 семінарскія гадзіны, завяршалася экзаменам; на завочным аддзяленні – 18 і 12 гадзін адпаведна, здавалі залік [7, арк. 199, 200]. У 1960 г. была створана кафедра бібліяграфіі (загадчык М. Ц. Талкачоў), прадоўжылася падрыхтоўка навукова-педагагічных кадраў праз аспірантуру [2], курс «История книги» з кафедры бібліятэказнаўства «перайшоў» разам з выкладчыкам М. М. Коласам на новую кафедру. Аднак 1960/1961 навучальны год стаў апошнім, калі старшы выкладчык-сумяшчальнік М. М. Колас чытаў «Историю книги» на першым курсе стацыянара, на вячэрнім і завочным (першы і другі курсы) аддзяленнях [7, арк. 199]. У тым навучальным годзе, як занатавана ў плане вучэбна-метадычнай работы, ён, відаць, здолеў «1) Подготовить текст лекции на тему “Первые декреты советской власти о печати и книгоиздательском деле” (ноябрь 1960 г.), 2) Подготовить план материала по организации на 1-м курсе вечера на тему “Книга в истории России” (декабрь 1960 г.), 3) Подготовить материал к историографии истории книги СССР и БССР (июнь 1961 г.)» [7, арк. 335].

Семінарскія і практычныя заняткі па гісторыі кнігі вялі і іншыя выкладчыкі – К. Г. Маўрычава [7, арк. 200], М. І. Савачкіна [7, арк. 202, 328], Л. М. Буракіна [7, арк. 327], В. М. Дзмітрыева [7, арк. 331], Н. С. Чарненка [7, арк. 333],

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Н. М. Цацуліна [7, арк. 334]. Праўда, у 1961/1962 навучальным годзе «Историю книги» даручылі распрацоўваць новаму штатнаму выкладчыку кафедры бібліяграфіі – *Таісіі Цімафееўне Світкоўскай* [10, арк. 371; 11, арк. 625; 12, арк. 539]. Пасля яе паступлення ў аспірантуру па спецыяльнасці "бібліяграфія грамадска-палітычнай літаратуры"[1] (Ленінградскі бібліятэчны інстытут) [13, арк. 196] эстафета пераходзіць да *Ніны Мікалаеўны Цацулінай* [10, арк. 468; 12, арк. 489; 14, арк. 22], таксама выпускніцы МДПІ [9, арк. 31 адг.] і выкладчыка бібліятэчнага факультэта з 1958 г. [15, арк. 19]. Некаторыя тэксты лекцый маладых педагогаў абмяркоўвалі на пасяджэннях кафедры: у лютым 1962 г. – «Книга в России в 1895–1917 гг. Ч. 3. Большевистская печать» Т. Ц. Світкоўскай, у сакавіку 1962 г. – «Типы естественнонаучной литературы и их читательское назначение» Н. М. Цацулінай [36, арк. 75].

Свой самастойны курс «История книги» Н. М. Цацуліна «в основном освоила и прочла удовлетворительно» ў 1962/1963 навучальным годзе на ўсіх першых курсах стацыянара, вячэрнім і завочным аддзяленнях. Хоць цяжкасць выкладання, безумоўна, была выклікана не толькі адсутнасцю падручніка, неабходнасцю глыбейшай распрацоўкі зместу курса, але і патрэбамі ўдасканалення методыкі яго выкладання [16, арк. 3], якое суправаджалася экскурсіямі ў аддзел рэдкай кнігі Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна (ДБЛ БССР) і адпаведнымі кантрольнымі заняткамі. Экзамен праводзіўся ў выглядзе сумоўя без білетаў – для стацыянара, для завочнікаў прапаноўваліся выкананне самастойнага задання і вусны залік. Сярод уласных распрацовак Н. М. Цацулінай, якія выносіліся на абмеркаванне кафедры, – лекцыя на тэму «Книга в БССР после XX съезда КПСС» (красавік 1964 г.) [17, арк. 16]. Выкарыстоўвала выкладчык і набыткі беларускай філалагічнай навукі, калі да 450-годдзя беларускага кнігадрукавання ў 1967/1968 навучальным годзе прапанавала студэнтам цікавыя практычныя заданні: «Письменность Белоруссии в XII–XVI вв.» (Л. Марозава); «Письменность Белоруссии в IX–XI вв.»

[1] Тэма кандыдацкай дысертацыі Т. Ц. Світкоўскай: «Состояние и перспективы развития библиографии общественных наук в БССР (1946–1965 гг.)», навуковы кіраўнік кандыдат педагагічных навук Галіна Максімаўна Міхайлава. – Гл.: 17, арк. 196.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Т. Гуманава) [21, арк. 1–2]. Заўсёды ў выкладанні Н. М. Цацулінай курса «История книги» адзначаўся «должный уровень» [19, арк. 1].

Менавіта Н. М. Цацуліна ў 1969/1970 нучальным годзе першая ў форме тэзісаў падрыхтавала метадычныя матэрыялы «Основы книгоиздательского дела в БССР» (машынапіс) [27, арк. 14], у агульны курс па гісторыі кнігі быў упершыню ўведзены новы раздзел «История белорусской книги» – у той час, калі адсутнічалі хоць якія-небудзь вучэбныя ці іншыя абагульняльныя матэрыялы [27, арк. 37]. Безумоўна, і сама выкладчык разумела, што трэба дапаўняць і пашыраць тэму гісторыі беларускай кнігі. Адначасова да юбілейных дат, такіх як 50-годдзе савецкай улады [21, арк. 1], 100-годдзе з дня нараджэння У. І. Леніна [27, арк. 46], неабходна было выдаткоўваць час на асвятленне і ўключэнне ў гісторыю кнігі абавязковых тэм: «Марксистско-ленинское учение о печати», «Большевистская печать», удзельнічаць у Ленінскіх чытаннях (выступала з дакладам «Ленин и книга» [28, арк. 86]) і чытацкай канферэнцыі для студэнтаў (тэмы: «Издание произведений В. И. Ленина до революции и в СССР», «Участие В. И. Ленина в организации и издании газет и журналов», «Издание произведений В. И. Ленина в БССР») [27, арк. 48].

У 1963 г. Н. М. Цацуліна «без отрыва от производства» [13, арк. 196] пачала працу па выкананні індывідуальнага аспіранцкага плана па дысертацыйнай тэме «Состояние и перспективы развития библиографии по биологическим наукам (русской и белорусской)» (навуковы кіраўнік доктар біялагічных навук П. Ф. Ракіцкі) [15, арк. 19]. Аднак вялікая педагагічная нагрузка не спрыяла таму, каб па заканчэнні аспірантуры ў чэрвені 1968 г. адбылася абарона дысертацыі [23, арк. 36], як і пасля гадавой аспірантуры ў Ленінградскім інстытуце культуры ў 1972/1973 навучльным годзе[2] [31, арк. 56]. Не атрымалася і ў Т. Ц. Світкоўскай з аспірантурай: у 1965 г. яна была прызначана на пасаду загадчыка бібліятэкі Мінскага дзяржаўнага інстытута замежных моў (сёння – Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт), на якой добрасумленна адпрацавала да

[2] Тэма дысертацыі Н. М. Цацулінай на той час – «Проблемы библиографии биологической литературы».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1979 г. [1], аддаўшы перавагу практычнай дзейнасці перад навуковай і выкладчыцкай. Вядома, тэмы дысертацыйных прац Т. Ц. Світкоўскай і Н. М. Цацулінай не былі наўпрост звязаны з распрацоўкай курса па гісторыі кнігі, а мелі сувязь з іншымі прадметамі галіновай бібліяграфіі, па іх яны ў асноўным і праводзілі вучэбныя заняткі, што адпавядала прынятай на факультэце канцэпцыі: за аснову навуковай працы «принять теоретическую разработку читаемых каждым преподавателем курсов» [14, арк. 2].

Па сутнасці, на стыку бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства абараняюць свае дысертацыйныя працы выкладчыкі: у чэрвені 1967 г. – М. І. Пакала «Современное состояние и перспективы развития книжных фондов сельских библиотек Белорусской ССР» [25, арк. 90], у канцы 1968 г. – В. Е. Лявончыкаў на тэму «Общая ретроспективная библиография книг Белоруссии: история и теория вопроса», у якой закранаўся шэраг тэрміналагічных пытанняў, у тым ліку беларускай кнігі [26, арк. 23, 24; 27, арк. 67]. Беларускія бібліятэказнаўцы звярталі ўвагу на неабходнасць вырашэння такіх метадалагічных пытанняў, як «определение наук библиотековедения и книговедения» (Н. М. Калоска) [22, арк. 23], выказвалі прапановы, каб намаганнямі кнігазнаўцаў, сацыёлагаў, бібліятэказнаўцаў, псіхолагаў і педагогаў стварыць навуку аб чытанні, бо «проблема руководства чтением имеет государственное значение, она затрагивает всю систему образования в стране, издательскую политику, все формы пропаганды» (Н. М. Калоска) [25, арк. 46]. Пры абмеркаванні курса Н. А. Ярохінай «Руководство детским чтением» [25, арк. 14] выказана прапанова звярнуцца да вызначэння паняцця «культура чтения» (К. Верабей, К. Г. Маўрычава). Наогул ва ўсіх спецыяльных курсах акцэнтавалася ўвага на тэрміналогіі (К. Г. Маўрычава), на тэарэтычных асновах кіравання чытаннем (М. І. Пакала) [20, арк. 2], на праблеме захавання і беражлівых адносін да кнігі (К. Г. Маўрычава) [22, арк. 14]. Для паспяховай навуковай працы, на думку выкладчыкаў кафедры бібліятэказнаўства, добра было б стварыць музей па гісторыі бібліятэчнай справы ў Беларусі, часткай якога стане гісторыя бібліятэчнага факультэта МДПІ [22, арк. 24]. Непасрэдна з кнігазнаўчай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблематыкай была звязана і дзейнасць прадметных камісій па бібліяграфічных дысцыплінах: «История книги и общая иностранная библиография» (Н. М. Цацуліна – старшыня, В. А. Буран, Р. А. Ровіна, М. Г. Розум), «Методика самостоятельной работы студентов с книгой» (В. Е. Лявончыкаў – старшыня, Т. М. Сакалова, Л. М. Буракіна, Н. С. Чарненка, Л. Г. Амяльковіч і інш.) [27, арк. 88].

На пачатку 1970-х гг. заўважна актывізуецца навуковая дзейнасць:

– плануюцца да выдання навуковыя манаграфіі, напрыклад «Библиография белорусской художественной литературы» (В. А. Буран), «Белорусская библиография (1917–1970)» (В. Е. Лявончыкава) [27, арк. 15];

– у тэматыцы дысертацыйных прац адлюстроўваецца імкненне да аналізу і абагульнення развіцця бібліятэчна-бібліяграфічнай навуковай думкі (першапачатковая тэма дысертацыі І. П. Емец – «Развитие библиотечно-библиографической мысли в Белоруссии»);

– на новы тэарэтычны ўзровень падымаюцца даследаванні ў галіне чытачазнаўства і культуры чытання (тэма дысертацыі В. А. Дукель – «Читательское восприятие открытого доступа к книжному фонду в массовых библиотеках БССР» [24, арк. 11], лекцыі Н. А. Ярохінай па курсе «Руководство детским чтением» [22, арк. 14], распрацоўваецца курс «Работа с читателями технической библиотеки» [33, арк. 13]);

– зацвярджаюцца дысертацыйныя тэмы па гісторыі беларускай кнігі: «Детская книга в Белоруссии 1917–1975 гг.» (В. М. Бігеза) [27, арк. 26], «Издание общественно-политической литературы для молодежи в Белоруссии (1946–1970)» (А. І. Саломка) [35, арк. 61];

– пераглядаецца навуковая праца выкладчыкаў у сувязі з неабходнасцю сацыялагічных даследаванняў пра ролю кнігі ў жыцці савецкага грамадства [27, арк. 76] і стварэнні спецыяльнага навуковага цэнтра пры ДБЛ БССР па сацыялагічных даследаваннях бібліятэчна-бібліяграфічных праблем [27, арк. 83], наладжваецца ўзаемадзеянне паміж бібліятэкамі Беларусі (ДБЛ БССР, навуковымі і абласнымі) і кафедрай бібліятэказнаўства МДПІ [24, арк. 31–44]. Адначасова аддаецца ўвага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

планаванню не гістарычных, а актуальных тэм, прысвечаных сучасным праблемам (В. Е. Лявончыкаў) [33, арк. 35, 36]. Тым не менш у гісторыка-кнігазнаўчым рэчышчы поўнай хадой ішла навукова-даследчая праца асістэнта бібліятэчнага факультэта (з 24 сакавіка 1972 г.) *Яўгеніі Сяргееўны Умецкай*, выпускніцы МДПІ 1948 г. [32, арк. 60], аспіранткі Інстытута гісторыі АН БССР[3]. Свае першыя вучэбныя курсы па гісторыі беларускай кнігі яна пачне чытаць ужо ў Мінскім інстытуце культуры. У апошні год існавання бібліятэчнага факультэта ў МДПІ курс «История книги» налічваў у вучэбным плане для першага курса на аддзяленні масавых і навуковых бібліятэк, дзіцячых і школьных 56 гадзін лекцый, 14 гадзін практычных заняткаў, завяршаўся залікам [35, арк. 10], на аддзяленні тэхнічных бібліятэк здавалі экзамен [35, арк. 14]. Курс «История книги» для студэнтаў чыталі і іншыя выкладчыкі: асістэнты М. Г. Розум[4], Г. І. Ціханава [18, арк. 1], старшыя выкладчыкі Н. С. Чарненка[5], В. А. Буран [27, арк. 37].

У 1970–1974 гг. савет бібліятэчнага факультэта прыняў шэраг пастаноў, якія датычылі ўвядзення новых курсаў ці раздзелаў, звязаных з беларускай тэматыкай. У адпаведнасці з асноўным накірункам навуковай дзейнасці «Развитие библиотечного дела в Белоруссии» [34, арк. 13]) з'явіліся новыя курсы: «Библиотечные фонды БССР» (М. І. Пакала) [29, арк. 15, 28], «Белорусская библиография» (В. Е. Лявончыкаў) [29, арк. 26], «История библиотечного дела в БССР» (М. І. Пакала) [31, арк. 36, 37, 49]. Аднак беларускі складнік у вучэбным працэсе на бібліятэчным факультэце МДПІ замацоўваўся не без цяжкасцяў, а яго абаронцам даводзілася аргументаваць, што ўсё ж

[3] У 1977 г. дысертацыя была паспяхова абаронена: История книгопечатания в Белоруссии в первой трети XIX века (1801–1832 гг.) : автореферат диссертации ... кандидата исторических наук: 07.00.02 / Умецкая Евгения Сергеевна. – Минск, 1977.

[4] Методические рекомендации универсальным и отраслевым научным библиотекам Белоруссии / Гос. б-ка БССР им. В. И. Ленина; [сост. Н. Г. Розум [и др.]. – Минск: Гос. б-ка БССР, 1987. – 125 с. Тэма кандыдацкай дысертацыі: «Библиографическая работа в педагогических институтах (1959–1965 гг.). По опыту пединститутов БССР и РСФСР». – Гл.: 17, арк. 45.

[5] Тэма кандыдацкай дысертацыі: «Пропаганда библиографических знаний и культуры чтения в средних специальных учебных заведениях (1959–1964 гг.)». – Гл.: 17, арк. 36.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«знание национальной культуры – обязательное условие подготовки пропагандистов» (В. А. Факееў) [33, арк. 76]. Разам з увядзеннем вучэбных курсаў з беларускім складнікам намецілася тэндэнцыя папаўнення кнігазнаўчых курсаў: акрамя «Истории книги» распрацоўваўся курс «История технической книги» [33, арк. 13], а таксама курс «Руководство детским чтением» [22, арк. 14]; адпаведна планаваліся новыя кафедры (кафедра тэхнічнай кнігі, навуковай інфармацыі і асноў вытворчасці [29, арк. 29, 30, арк. 44–48] і інш.).

Такім чынам, адзначым, што з сярэдзіны 1950-х да сярэдзіны 1970-х гг. дзякуючы маладым выкладчыкам, якія атрымалі падрыхтоўку на бібліятэчным факультэце МДПІ, працягваўся эвалюцыйны працэс развіцця беларускай бібліятэчнай адукацыі, змястоўна пашыраўся як беларускі, так і кнігазнаўчы складнік у вучэбна-метадычнай і навуковай дзейнасці, гісторыя кнігі, у тым ліку беларускай, паступова і ўсё больш прываблівала да свайго прадметнага кола таленавітыя кадры, сярод якіх сапраўднымі першапраходцамі былі *М. М. Колас і Н. М. Цацуліна*, аб чым і сведчаць прыведзеныя архіўныя звесткі.


*1.* Библиотека МГЛУ : История. Современность. Перспективы. – URL: http://lib.n.mslu.by/stranicy-istorii.

*2.* Библиотечный факультет // Минский ордена Трудового Красного Знамени государственный педагогический институт имени А. М. Горького (1922–1972). – Минск : Вышэйш. шк., 1974. – С. 298–299.

*3. Доўнар, Л. І.* Першыя выкладчыкі курса «История книги» на бібліятэчным факультэце / Л. І. Доўнар // Библиотеки и музеи в современной и социокультурной среде : сохранение традиций и перспективы развития : материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 75-летию ФИДК БГУКИ (Минск, 24–26 сент. 2019 г.) : в 2 ч. – Минск : БГУКИ, 2019. – Ч. 1. – С. 49–55.

*4.* Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 746, воп. 1, спр. 101.

*5.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 113.

*6.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 123.

*7.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 1, спр. 145.

*8.* НАРБ. Ф. 746, воп. 4, спр. 47.

*9.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 70.

*10.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 80.

*11.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 92.

*12.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 4, спр. 93.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*13.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 52.
*14.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 68.
*15.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 117.
*16.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 118.
*17.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 256.
*18.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 257.
*19.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 342.
*20.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 429.
*21.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 431.
*22.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 506.
*23.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 507.
*24.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 580.
*25.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 581.
*26.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 582.
*27.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 662.
*28.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 694.
*29.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 745.
*30.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 788.
*31.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 855.
*32.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 882.
*33.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 1048.
*34.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 1068.
*35.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, спр. 1153.
*36.* НАРБ. – Ф. 746, воп. 5, т. 1, спр. 53.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА Ў КАНТЭКСЦЕ ДАСЯГНЕННЯЎ АЙЧЫННАЙ НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ШКОЛЫ

***С. В. Зыгмантовіч,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

***В. І. Саітава,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт,*
*прафесар кафедры Бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Адной з формаў кансалідацыі навукоўцаў для вырашэння тэарэтыка-метадалагічных і прыкладных навуковых праблем з’яўляецца стварэнне навуковых школ. Функцыянальны патэн-